*А.І. Белая* (Баранавічы)

# ЧАС І ЧАЛАВЕК У БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ К. ЧОРНАГА)

Сярод найбольш значных з'яў літаратурнага жыцця нашаніўскага перыяду даследчыкі традыцыйна адзначаюць дыскусію 1913 года аб шляхах развіцця беларускай літаратуры. Нашу ўвагу, у прыватнасці, прыцягвае канстатацыя Ю. Верашчакам факта адсутнасці ў ёй "шукання новых праўд, новых дарог", "тыпу чалавека будучыны" [5, с. 10-12]. Праблема, нават патрабаванне, новага героя востра паўстала і ў драматызаванай аповесці М. Гарэцкага "Антон" – "новага, жывога чалавека, каторы б... паказаў, як глядзець у будучыну, .... браць яе з усіх бакоў рукамі". Думаецца, проза К. Чорнага акрэсленага вышэй перыяду адпавядала такому патрабаванню, бо пісьменнік у сваіх творах паказваў актуальныя "прычыны паяўлення" новага чалавека ў жыцці, не пагарджаючы, аднак, неабходнасцю "ўплесць агульначалавечыя пытанні" [5, с. 20-21]. Гэта знайшло адлюстраванне, у прыватнасці, у наступнай метафары: "... каloціцца вялікая машына жыцця, утрапёная, узбунтованая, непакорная, што захавала ў сабе побач жа і цішыню" [4, с. 116].

Нягледзячы на тое, што гістарычныя сітуацыі мяняюцца, "не мяняецца неабходнасць для чалавека быць у свеце, быць у ім за працай, быць у ім сярод другіх і быць у ім смяротным" [2]. (Асноўная сутнасць прыведзеных экзістэнцыйных высноў геніяльна спрацыравана К. Чорным на адметнасць беларускай ментальнасці ў лапідарным "трэба жыць" і "трэба варушыцца".)" Улік у мастацкім тэксце гэтых акалічнасцей найперш і пазбаўляе твор небяспекі адысці разам з часам, які яго спарадзіў.

Між тым, час выяўляе не толькі фізічную працягласць зямнога існавання чалавека, а і выразна акрэслены спосаб перажывання ім свету [1] – гэта значыць, не столькі чалавек у часе, колькі час у чалавеку ажыццяўляе пэўныя змены. Першая трэць XX стагоддзя – эпоха найбольш інтэнсіўных, радыкальных змен у жыцці соцыуму і чалавека, арыгінальна ўвасобленых у прозе К. Чорнага. Пісьменнік неабыякавы да лёсу зямлі, "якая праз стагоддзі залечвала ўсе свае раны ад сутычак народаў, <...> па якой гэтак цяжка ісці і выцягаць з яе... салдацкія боты" [3, с. 111]. Для герояў яго апавяданняў "Семнаццаць год" , "Спатканні зваспаватым чалавекам", "Сям'я Юрыя Гарэйкі" і інш. вайна – гэта час, калі "свет зжываў сябе" [3, с. 110], дзе "дзень часта – эпоха" [3, с. 131], а таму ў іх "зусім свае, ... адмыс-

ловае разуменне адпачынку, спакою, трывогі...” [3, с. 123] Яно, аднак, не знішчала дашчэнту здольнасці герояў бачыць “чалавечую ўтульнасць” [3, с. 111] ацалелага хутара ці тое, як нават у спаленай вёсцы “сяляне (“трэба жыць”! – А.Б.), са звыклаю павольнасцю сваёю, выбіралі на папялішчах асмаленае бярвенне і ўжо браліся дажынаць пераспелае жыта” [3, с. 125]. Герой К. Чорнага, навяваўшыся “ці за што, ці за нічога” [3, с. 169], верыць, што рэвалюцыя – “за яго, яна ідзе на дапамогу гэткім людзям, як ён” [3, с. 177]. Прадстаўнікі гэтага пакалення мусяць пагадзіцца і з тым, што на іх вяку “ўсё ўсталёўвацца... будзе”, а ўжо дзецям, вераць, будзе лепш [4, с. 219]. Прасцей у новым часе тым, чыё сталенне, як у герояў рамана “Сястра”, супала са сталеннем эпохі: “Няхай ломіцца і аднаўляецца – у гэтым працэсе і маё вялікае месца...” [4, с. 123]

Стаўленне аўтара да адлюстраванага часу і чалавечых пошукаў месца ў ім неадназначнае, што яскрава пацвярджаюць улюбёныя вобразы К. Чорнага: бур, цішыні, ветру, зямлі, травы і інш. ... Калі лексема “зямля” з поўным правам можа лічыцца ключавой у прозе пісьменніка, то “трава” – адна з дамінантных. Заўважаецца абагульненне ў гэтым вобразе аўтарскага погляду на чалавечы лёс у тых ці іншых сацыяльных варунках, на ступень праяўленасці волі герояў да жыцця. Пагаджаючыся з тым, што толькі “навальніца можа ачысціць паветра”, а дождж “змые з зямлі ўсю гразь і бруд”, пісьменнік-гуманіст, тым не менш, не прымае таго, што нямала “прыбіта, выкарчавана і знесена немаведама куды травы, дзеля якое і навальніца была!..” [4, с. 60]

Аналіз вышэйзгаданых і іншых сэнсаўтваральных асаблівасцей прозы К. Чорнага першай трэці мінулага стагоддзя дае ўяўленне пра агульначалавечую універсальнасць і, разам з тым, нацыянальна-гістарычную адметнасць аўтарскай філасофска-эстэтычнай канцэпцыі часу і чалавека.

***Літаратура***

1. Тычына М. Прывід гіпертэксту. – ARCHE. – 2006. – № 3.– С. 74.
2. Сартр Ж.П. Экзистенциализм – это гуманизм // Всемирная философия. XX век / Авт.-сост. А.П. Андриевский / Ю.М. Бохеньский.– Минск: Харвест, 2004.– С. 626.
3. Чорны К. Збор твораў: У 8 т. Т. 2: Апавяданні 1928 – 1944 гг. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1972. – 488 с.
4. Чорны К. Збор твораў. У 8 т. Т. 3: Раманы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1973. – 544 с.
5. Чыгрын І.П. Паміж былым і будучым: проза Гарэцкага. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 166 с.